*УДК 821.161.3-3*Ю.Станкевіч:17:140.8:141.21:165.742*

**А. В. Рудніцкая**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# ЭТЫКА ТРАНСГУМАНІЗМУ Ў ТВОРЧАСЦІ Ю. СТАНКЕВІЧА: МІФАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

*У артыкуле на прыкладзе аповесці «Эрыніі» і рамана «П‘яўка» Ю. Станкевіча асэнсоўваюцца адметнасці рэалізацыі ідэй міфалагічнага трансгуманізму ў мастацкай літаратуры і ацэнка пісьменнікам асноўных тэзісаў гэтага філасофскага руху. Робіцца выснова пра актыўны зварот аўтара да метафарычных засцярог для данясення ідэі захавання чалавечага пачатку ў грамадстве і нацыі ў цэлым.*

Проза Ю. Станкевіча вядомая сваім песімістычным пафасам, настроямі роспачы і зняверу. Відавочна, аўтар настолькі расчараваўся ў чалавечай цывілізацыі, што дзеля яе выратавання ў сваіх мастацкіх тэкстах нярэдка заклікае на дапамогу звышсілы, дадаючы сацыяльнай фантастыцы (антыўтопіям) міфалагічны каларыт.

Так, у аповесці «Эрыніі» разгортваецца нядрэнны дэтэктыўны сюжэт аб жорсткіх забойствах мясцовых «аўтарытэтаў» (араба і кітайца), расследаваць якія прыязджае чалавек з Мегаполіса па прозвішчы Следак («Следак, з націскам на першы склад, але якога ўсе калегі і знаѐмыя называлі Слядак <на слэнгу і азначае – следчы>» [1 с. 8]). Насамрэч мэта прыезду гэтага персанажа іншая: па загадзе кіраўніцтва ѐн імкнецца завербаваць забойцаў у нацыяналістычную арганізацыю для барацьбы з так званым сацыяльным дном. Шэрыф накіроўвае Следака на начлег да былога навукоўца ў выгнанні Крэза, дзе малады супрацоўнік КрымПА даведваецца, што да здзяйснення апісаных вышэй злачынстваў маюць адносіны міфалагічныя істоты – Эрыніі: «–Жыве хто?‖ – спытаў Слядак. – –Эрыніі‖. –Эрыніі, наколькі я ўспамніаю, багіні помсты, і пражывалі яны, паводле міфа, у пекле‖» [1, с. 25]. Як вядома, Эрыніі (ад грэчаскага «гнеў») – у антычнай міфалогіі багіні помсты, якія пераследуюць злачынцу, насылаючы на яго вар‘яцтва.

Т. Кавалеўская ў сваім артыкуле «Міфалагічны трансгуманізм у рускай культуры», дзе апісваюцца разнастайныя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

формы трансгуманізму, у прыватнасці рэлігійныя і міфалагічныя, выказвае цікавую думку: «Трансгуманізм, г. зн. імкненне да дасягнення неўміручасці і боскасці, з‘яўляецца істотнай рысай чалавечай тэалогіі на працягу ўсяго існавання. У сучаснай секулярнай аметафізічнай культуры самаабагаўленне праз смерць ператвараецца альбо ў самаабагаўленне ў смерці (вампірызм), альбо ў анімалізме (пярэварэтніцтва). У сучаснай рускай культуры філасофская праблематыка саступае месца сацыяльна-палітычнай, і вампірызм, і пярэваратніцтва выкарыстоўваюцца як алегарычны спосаб заклікаць да талерантнасці…» [2, с. 15]. У аповесці Ю. Станкевіча «Эрыніі» назіраецца другі варыянт «самаабагаўлення» – пярэваратніцтва, якое праяўляецца ў здольнасцях трох пакрыўджаных жанчын пераўвасабляцца ў вялізных птушак з мэтай аднаўлення справядлівасці і пакарання злачынцаў.

Дарэчы, гэтыя пярэваратні знешне істотна адрозніваюцца ад аўтэнтычнага апісання міфалагічных Эрыній: «–Маладыя жанчыны, прыгожыя. На перадплеччы ў кожнай аднолькавая татуіроўка‖.

–І якая?‖ –Выява птушкі ў палѐце. Чайкі‖. –Па-вашаму, маладыя жанчыны могуць лѐтаць? Эрыніі ж быццам лѐталі?‖ –Яны пераўвасабляюцца. Валодаюць магіяй‖» [1, с. 26]. У старажытнагрэчаскім міфе Эрыніі Тысіфона, Алекта і Мегера апісваюцца –як тры агідныя старыя жанчыны‖ [3] з валасамі, перавітымі ядавітымі змеямі, чорнай сабачай пысай замест твару і крыламі кажаноў. З жахлівай пашчы пачвараў высоўваўся доўгі язык і капала кроў. Галасы Эрыній нагадвалі рык жывѐлы ці сабачы брэх. У руках яны трымалі запаленыя факелы або прылады для страшэнных катаванняў. Часам Эрыніі маляваліся ў выглядзе сабак або змей, што падкрэслівала іх хтанічны характар. Паводле іншага меркавання, Фурыі, так называлі старажытныя рымляне гэтых істот, уяўлялі з сябе персаніфікацыю вобраза злой маці, што ўзнік з дзіцячага страху смерці.

Трансгуманізм у яго міфалагічнай іпастасі – гэта выхад за межы чалавечых магчымасцей, дасягненне бессмяротнасці не пры дапамозе НТП, а перш за ўсѐ за кошт самаўсведамлення чалавекам сваѐй метафізічнай прыроды. Першавытокам магчымага з‘яўлення Эрыній становіцца цяжкі лѐс трох маладых дзяўчат, якія былі высланы з Мегаполіса на перавыхаванне, ці «хімку»: «Яны былі маладыя, прыгожыя дзяўчаты, шчырыя, сумленныя, але, як бы вам сказаць, вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

суровыя, змрочныя, і ад іх веяла помстай. Пэўна, яны шмат пакутавалі» [1, с. 47]. Аднак Ю. Станкевіч не паведамляе, як з простых і кволых дзяўчат атрымаліся міфалагічныя багіні помсты, што нястомна каралі смерцю людзей, на сумленні якіх было злачынства: «Нябожчык пры жыцці не пакутаваў ад анеміі, раптоўнасць смерці ад інфаркту ці інсульту амаль выключалася. Тып утаплення быў нехарактэрны. Пры сапраўдным утапленні ўзнікае тыповая асфіксія: спачатку рэфлекторная затрымка дыхання, якая працягваецца да хвіліны, потым вада трапляе ў лёгкія. Настае стойкае спыненне ў выніку паралічу дыхальнага цэнтра, а праз пяць–дзесяць хвілін спыненне сэрца. Тут жа быў іншы выпадак» [1, с. 13]. Ці:

«Зураб, у адрозненне ад большасці сваіх супляменнікаў, не цураўся вады, лічыў сябе выдатным плыўцом і не раз заплываў у возеры на кіламетр і нават далей. Але праз тыдзень пасля нечаканай гібелі Ларыёна амаль тое ж самае здарылася і з ім. Акрамя характэрнай эмфіземы лёгкіх і пены вакол дыхальных адтулін носа і рота, эксперт адзначыў усё тыя ж механічныя пашкоджанні ў выглядзе неглыбокіх ран на чэрапе, быццам ад удараў вострым прадметам, выбітыя – і ад таго выцеклыя – абодва вокі» [1, с. 13–14].

Заўважна, што ў абодвух выпадках перад тым, як забіць, Эрыніі выколвалі ахвяры вочы. Навошта яны гэта рабілі? Існуе меркаванне, што погляд чалавека, які знаходзіцца на піку эмоцый, можа валодаць незразумелай сілай, здольнай нанесці шкоду таму, на каго яна накіравана. Атрымліваецца, адной з магчымых прычын завязвання павязкай вачэй перад смяротным прысудам ці крывавае асляпленне ахвяры ў старажытная часы лічылася пэўнай засцярогай. Але гэтае вытлумачэнне ў кантэксце аповесці малаверагоднае. З вядомага выказвання «вочы – люстэрка душы», вынікае, што душа, апаганеная бруднымі справамі, павінна растварыцца ў небыцці ці, як у нашым выпадку, – у багне малавядомага Паселішча. Адмысловым чынам пакаралі Эрыніі і Імбецыла – распусніка і гвалтаўніка: «–Тэстулы выдалены прафесійна‖, – з ноткай сарказму патлумачыла яна, –

–заражэння няма, усѐ зажыве, ѐн хіба што патаўсцее‖» [1, с. 60]. Зразумела, што апісаныя вышэй зверствы не маглі зрабіць звычайныя маладыя жанчыны. Пісьменнік даводзіць, што людскія кроў і слёзы, наскрозь пранізаная Злом акаляючая рэчаіснасць, «у параўнанні з якім любая нежыць, погань, пачвары



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аказваюцца рамантычнымі і нават выратавальнымі <...>» [1, с. 32], і зрабіла з маладых асоб вяршыцелей правасуддзя.

У рамане Ю. Станкевіча «П‘яўка» таксама назіраюцца праявы міфалагічнага трансгуманізму, які выяўляецца ў матыве дасягнення чалавекам неўміручасці праз вампірызм. І. Талаконнікаў адзначае:

«Ператварэнне ў нежыць – яшчэ з адна форм эскапізму, сыходу ад свету, які ўяўляецца непаўнавартасным. Трансчалавечнасць цяпер дасягаецца адным укусам нежыці. Смерць зноў побач, але яна ўжо не вядзе на метафізічны ўзровень быцця. Больш за тое, для яе ўжо не патрабуюцца намаганні волі, гераічныя рашэнні. Вампірызм задавальняе два асноўныя патрабаванні: ѐн надае трансчалавечы статус хутка і лѐгка. Перашкоды, адоленыя героямі на шляху да неўміручасці ў смерці (а не праз смерць)» [4, с. 45]. З вышэй адзначанага зразумела, што Ю. Станкевіч пад п‘яўкай мае на ўвазе не чарвяка-крывасмока. Паводле сюжэта твора, збой у Праграме абуджае вампіраў, здольных высмоктваць з чалавека ўсю жыццѐвую энергію, каб потым зрабіць ахвяру падуладнай сабе. П‘яўка, па сутнасці, увасабляе антыўтапічную дзяржаву, варожых прыхадняў, СМІ, і нават каханы чалавек можа ператварыцца ў гэтую жахлівую істоту. Прычым данатарамі становяцца найперш людзі духоўна слабыя і бязвольныя: «Самец данатара – абмежаваны, лѐгка ўнушаемы, скараецца перад любым сорнерам і адразу пачынае яму прыслугоўваць. У асобных выпадках, падпадаючы пад уплыў прыхадняў, ѐн становіцца агрэсіўным ненавіснікам сваѐй мовы і культуры. Самка данатара – істэрычная, юрлівая, абмежаваная, схільная да здрады. Улюбѐныя заняткі – пап-шоў, прастытуцыя, судавытворчасць, выхаванне чужых дзяцей, фемінізм. Выключная большасць данатараў – так званыя ―сліперы‖ – псеўдалюдзі, залежныя ад масавага гіпнозу» [5, с. 209]. Іншымі словамі, паводле Ю. Станкевіча, вампірызм – неперсаможная з‘ява, бо чалавек не імкнецца духоўна ўдасканальвацца. Выратаванне, на думку пісьменніка, магчымае толькі ва ўменні браць адказнасць за сябе і сваѐ жыццѐ. Толькі так можна выратавацца ад паразітаў-крывасмокаў і самому не пераўтварыцца ў п‘яўку, бо мяжа чалавечай сілы і слабасці заўсѐды вельмі адносная.

Такім чынам, у прозе Ю. Станкевіча трансгуманізм прадстае яшчэ ў адной іпастасі – міфалагічнай, што прадугледжвае дасягненне неўміручасці не пры дапамозе навукова-тэхнічнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прагрэсу, а за кошт асэнсавання метафізічнай прыроды чалавека і яе трансфармацыі шляхам пярэваратніцтва. У рамане «П‘яўка» такі падыход рэалізуецца праз матыў вампірызму, а ў аповесці «Эрыніі» – помсты чалавекаптушак злачынцам. Прычым міфалагічны складнік становіцца арганічнай часткай створанай пісьменнікам антыўтапічнай рэальнасці, якая заклікана метадам –ад супраціўнага‖ ўвсобіць ідэю неабходнасці захавання чалавечага ў чалавеку.

## Спіс літаратуры


1 Ковалевская, Т. В. Мифологический трансгуманизм в русской культуре / Т. В. Ковалевская // Вестник славянских культур: Литература. Литературоведение. Устное народное творчество. – 2016. – С. 13 – 25.

2 Станкевіч, Ю. Мільярд удараў / Ю. Станкевіч. – Мінск: –Галіяфы‖, 2008. – 321 с.

3 Великая энциклопедия мифов и легенд [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vsemifu.com/mifu/antika/erinii.php. – Дата доступа: 12.04.2017.

4 Толоконников, И. 80-е под знаком киберпанка / И. Толоконников // Фантакрим MEGA. – 1991. – №5. – С. 78.

5 Станкевіч, Ю. П‘яўка: раман / Ю. Станкевіч. – Мінск: –Галіяфы‖, 2010. – 280 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ